24 мая 2019 г. у Шчучынскім раёне праведзена выязная адкрытая прыёмная для прадстаўнікоў бізнесу

У мерапрыемстве прыняла ўдзел намеснік старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Бубенчык Алена Аляксандраўна і старшыня Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта Сяргей Васільевіч Ложачнік.



Прадстаўнікі бізнес-супольнасці раёна атрымалі магчымасць пракансультавацца са спецыялістамі розных службаў і ведамстваў абласнога ўзроўню, у тым ліку з сферы эканомікі, банкаўскай справы, падатковых і іншых органаў.









За дзве гадзіны працы "адкрытай прыёмнай бізнесу" яе наведалі каля пяцідзесяці чалавек: прадстаўнікі прыватнага і дзяржаўнага бізнесу, сярэдняга і малога. Абласныя спецыялісты пракансультавалі кожнага, хто звярнуўся, і далі вычарпальныя адказы.


www.grodnonews.by


www.grodnonews.by